Зусім маладым прыйшоў у беларускае кінамастацтва Міхаіл Пташук, але ўжо першыя працы прынеслі яму рэпутацыю сур'ёзнага, цікавага рэжысёра. На працягу сваёй творчай біяграфіі ён ствараў фільмы розных жанраў і маштабаў – ад рамантычных твораў і прыгодніцкіх тэлесерыялаў да глыбока псіхалагічных стужак – неаднаразова адзначаных на рознага рангу фестывалях.

Міхаіл Мікалаевіч Пташук нарадзіўся ў вёсцы Федзюкі Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Прафесійную адукацыю атрымаў у Маскоўскім тэатральным вучылішчы імя Б.Шчукіна (1967) і на Вышэйшых рэжысёрскіх курсах Дзяржкіно СССР (1972, майстэрня Г.Данелія). Працаваў у тэатрах Масквы і Казані, а з 1974 г. яго дзейнасць была звязана з кінастудыяй "Беларусьфільм". У лістападзе 1989 г. пры Саюзе кінематаграфістаў рэспублікі М.Пташук арганізаваў Беларускую незалежную студыю і стаў яе мастацкім кіраўніком.

Першая самастойная работа – фільм "Пра Віцю, пра Машу і марскую пяхоту" (1973; Гран-пры Міжнароднага кінафестывалю ў Іспаніі), пастаўлены ім на Адэскай кінастудыі. Фільм для дзяцей, у якім галоўныя героі – дзеці. У работах Пташука была нейкая псіхалагічная зададзенасць па ўзроставай лініі. Другая яго карціна "Лясныя арэлі" (1975) – гэта ўжо пра падлеткаў, якія набліжаюцца да юнацкага ўзросту.

Значнае месца ў творчасці Міхаіла Пташука займала тэма Вялікай Айчыннай вайны. Гераічнай барацьбе беларускага народа з фашысцкімі захопнікамі прысвечаны такія яго кінастужкі і тэлевізійныя фільмы, як "Нас выбраў час" (1978, сцэнарый А.Петрашкевіча і У.Халіпа, прэмія Ленінскага камсамола 1980), "Вазьму твой боль" (1981, паводле твора І.Шамякіна, Дзяржаўная прэмія БССР 1982), "Знак бяды" (1986, паводле аповесці В.Быкава, Гран-пры на МКФ у Югаславіі 1986, у Англіі 1987). Праблемы фарміравання і выяўлення чалавечага характару ў складаных жыццёвых абставінах знайшлі адлюстраванне ў фільмах "Наш браняпоезд" (1988), «Кааператыў "Палітбюро", або Будзе доўгім развітанне» (1992; Сярэбраны прыз на МКФ у Варшаве 1992, Гран-пры на МКФ "Залаты віцязь" 1994, Гран-пры на МКФ у Празе 1995, Стакгольме і Бялградзе 1996) і іншых работах кінарэжысёра.

Міхаіл Мікалаевіч шмат зрабіў для ўмацавання і развіцця творчых сувязяў паміж беларускімі і расійскімі кінематаграфістамі. Яскравым прыкладам плённага супрацоўніцтва стала стварэнне фільма "У жніўні 44-га" паводле рамана "Момант ісціны" Уладзіміра Багамолава, які атрымаў Гран-пры ў намінацыі мастацкіх фільмаў на X Міжнародным кінафестывалі славянскіх праваслаўных народаў "Залаты віцязь". Гэта вельмі сюжэтная гісторыя з цікавымі чалавечымі лёсамі, адносінамі, дзеянне якой адбываецца ў Заходняй Беларусі.

Сярод іншых фільмаў рэжысёра – прыгодніцкі тэлесерыял "Чорны замак Альшанскі" (1984) паводле аднайменнага рамана У.Караткевіча, камедыя "Гульня ўяўленняў" (1996), у якой спалучаюцца лірызм і добразычлівы гумар, фільм-спектакль Мінскага тэатра "Вольная сцэна" "Макбет" (1997).

Сваім багатым вопытам ён шчодра дзяліўся з вучнямі, актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы маладых рэжысёраў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Творы Міхаіла Пташука карыстаюцца вялікай папулярнасцю і прызнаннем гледачоў.

Памёр М. Пташук 26 красавіка 2002 г.